ГАННА САКОВІЧ
Беласток

# ШЧЫРАЯ СПОВЕДЗЬ ПРА ПЕРАЖЫТАЕ. *ПОЖНЯ* ВАСІЛЯ ПЕТРУЧУКА

У прозе членаў беларускага літаратурнага аб'яднання "Белавежа" знайшла пацвярджэнне адна з агульных тэндэнцый развіцця беларускай літаратуры другой паловы XX ст., а менавіта актывізацыя аўтабіяграфічнага моманту. Чым жа абумоўлена абвастрэнне ўвагі да жыцця канкрэтнага чалавека? У прыватнасці, Вераніка Стральцова выдзяляе тры галоўныя падставы, што садзейнічалі ўзмацненню аўтабіяграфічнай плыні ў нацыянальнай прозе. Найперш – увага да асобы, вяртанне да індывідуальнага, асабістага "я" ў адрозненне ад калектыўнага "мы", якое было прэферавана ў сацыяльнай псіхалогіі савецкіх часоў. Другой, хіба найбольш значнай, падставай былі грамадска-палітычныя змены. Маецца тут на ўвазе замена падцэнзурнасці друкаванага слова, якая *паклікала да жыцця хвалю так званай "новай шчырасці", спавядальнасці, прынцыповай адкрытасці*[1]. І ў якасці трэцяга аспекту змены жанравага дыяпазону даследчыца выдзяляе трансфармацыю літаратурнай традыцыі па прынцыпу супрацьлегласці, як выніку рэакцыі на доўгачасовую перавагу ў айчыннай літаратуры буйнамаштабных форм з ідэалагізаванай прапагандысцка-агітацыйнай праблематыкай.

Трэба адзначыць, аднак, што "белавежцы" знаходзіліся ў некалькі іншых умовах – мелі больш магчымасці для шчырага, адкрытага вы-

---

[1] В. Стральцова, *Шлях да сябе. Сучасная аўтабіяграфічная проза як мастацкая сістэма*, Мінск 2002, с. 92.



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

казвання. Ды стварэнне вялікіх па аб'ёму форм патрабуе засяроджанасці, часу, вольнага ад працы. Невыпадкова, што большасць празаічных твораў былі напісаны "белавежцамі" ўжо ў пенсійным узросце. Георгій Валкавыцкі (1923) – стваральнік, першы рэдактар беларускамоўнага тыднёвіка "Ніва", змог цалкам аддацца творчай працы толькі ў 1987 годзе, пакінуўшы рэдактарскае крэсла. Успаміны аб сваім жыцці пісьменнік выклаў у кнігах: *Віры. Нататкі рэдактара* (Беласток, 1991), *Белая вязь* (Беласток, 1998), *У каменным крузе* (Беласток, 2000), *Ашчэпкі* (Беласток, 2002). Вядомы ён таксама як журналіст, паэт, грамадскі дзеяч. Менавіта Г. Валкавыцкі з'яўляецца ініцыятарам стварэння, першым старшынёй літаратурнага аб'яднання "Белавежа", старшынёй ГП БГКТ. Відавочна, было наканавана яму, каб жыццёвыя прыярытэты вызначыліся патрыятычнымі і творчымі памкненнямі.

Кранальны аповяд аб лёсе чалавека ў пераходны сацыяльна-грамадскі перыяд, багаты на ваенныя катаклізмы, а таксама аб сваім уласным хаджэнні па муках знаходзім у аповесці *З перажытага* (Беласток, 1996) Янка Жамойцін (1922–2003). Празаік, літаратурны крытык, публіцыст, грамадскі дзеяч, а перад усім пакутнік за ідэю беларушчыны, які яшчэ ў маладым узросце ўсвядоміў сябе беларусам, за што вызначана было яму прайсці шматлікія, жорсткія выпрабаванні. Я. Жамойцін па-мастацку трансфармаваў сваю біяграфію яшчэ і ў апавяданні *Лёсы іх сышліся ў Спаску* (Тэрмапілы, Беласток, 2002, № 6), дзе праз вобраз галоўнага героя Алеся абагульнена паказаў лёс мільёнаў палітычных вязняў. Істотна, што пісьменніку ўласціва хрысціянскае ўспрыманне лёсу. Нягледзячы на тое, што перажыў ён нечалавечыя іспыты, у яго творах не выказваюцца прэтэнзіі да каго б там ні было. Я. Жамойцін не шкадуе аб сваім выбары, які, з аднаго боку, вёў да пакут, а з другога – вызначыў патрыятычны, пачэсны шлях.

У значнай ступені аўтабіяграфічная творчасць Сакрата Яновіча (1936). Можна сказаць, што апрача гістарычнай аповесці *Сярэбраны яздок* (Мінск, 1978), яго мастацкія творы цалкам укладваюцца ў біяграфію пісьменніка. С. Яновіч вядомы таксама як перакладчык, журналіст, публіцыст, грамадскі і палітычны дзеяч. З'яўляецца ён аўтарам розных зборнікаў апавяданняў, аповесцяў, эсэ. Найзначнейшым творам пісьменніка прынята лічыць аўтабіяграфічную аповесць *Самасей* (Варшава, 1981, Мінск, 1992). Гэты твор цалкам упісваецца ў біяграфію С. Яновіча, хаця аповяд вядзецца ад трэцяй асобы. Адметнае месца займаюць у пераліку яго кніг *Дзённікі 1987–1995* (Беласток, 1997).

У параметры аўтабіяграфічнай прозы ўпісваецца і біяграфічны цыкл эсэ Міколы Гайдука (1933–1998) *Меркі майго дзяцінства* (Бе-



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

ларускі каляндар, 1988). Пісьменнік рэалізуе свае ўспаміны ў форме кароткіх апавяданняў. У цэнтры ўвагі пісьменніка дзіцячыя гады, якія відавочна найбольш паўплывалі на яго псіхічнае развіццё, сфарміравалі яго маральныя каштоўнасці.

Галоўны твор Васіля Петручука *Пожня* таксама заснаваны на аўтабіяграфічным матэрыяле. Пісьменнік нарадзіўся 23 жніўня 1926 года ў вёсцы Грабавец Гайнаўскага павета. В. Петручук дэбютаваў на беларускай мове ў 1975 годзе ў "Ніве" апавяданнем *Закалядаваў*. У "Літаратурным альманаху Белавежы" быў надрукаваны яго эцюд *Вярнулася сірочае шчасце* (Беласток 1988). Потым з'явіліся наступныя творы: *Карысная дурнота* (Беласток 1988), *Мая служба* (Беласток 1985), *Сіўка* (Беласток 1987), *Сям'я Мікітавых* (Беласток 1989), верш *Не пытай* (Беласток 1990 – у "Беларускіх календарах". З намовы Сакрата Яновіча В. Петручук пачаў працу над аповесцю *Пожня* на беларускай мове, якая пабачыла свет у Беластоку (1987 г.), Мінску (1991 г.), а на польскай мове – пад назвай *Ściernisko* (1986 г.). За гэтае выданне ён быў прыняты ў Саюз польскіх пісьменнікаў. У 1998 годзе выйшаў зборнік гумару *Клавуня, гэта я, твой Вася* (Беласток). Усе творы маюць аўтабіяграфічную аснову.

Пачынаецца *Пожня* з драматычнага аповяду пра тое, як зусім малым дзіцём пісьменнік асірацеў. Ганна Петручук, якой не хацелася жыць з некаханым чалавекам, давяла сябе да таго, што захварэла. Калі даведалася, што яна ўжо цяжарная, вельмі перажывала. Прадчуваючы, што няма ўжо для яе ратунку, горача малілася, каб дзіцятка выжыла. Пісьменнік з горыччу піша пра сваё дзяцінства, пра жыццё без мацярынскай ласкі: *Яна* (маці – А. С.) *нават не падумала, мусіць, ніколі, што я – у нармальных умовах, без вайны і канцлагераў – прайду пекла. Адкуль мама магла ведаць тое, што я буду паранены нажом за бульбіну, якую хацеў з'есці на снеданне, што тварог, якім карміла сваё дзіцё мачаха, будзе растаптаны яе нагою, калі я нагнуся, каб яго падняць з падлогі і з'есці...*[2].

Ад веку жыццё на вёсцы было пакутнай, цяжкай, часта, можна сказаць, катаржнай працай, чаму садзейнічала сацыяльна-эканамічная сітуацыя сялянства, заўсёды па-свойму несправядлівая, трагічная. Сакрат Яновіч пра вопыт маленства героя В. Петручука засведчыць: *Свет Петручука сардэчна блізкі майму, заварожанаму чарадзейным шкельцам на лугах сялянскага дзяцінства ды юначасці. Але на гэтым і кан-*

[2] В. Петручук, *Пожня*, Мінск 1991, с. 6.



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

*чаюцца падабенствы нашых лёсаў. Ён гадаваўся сіротаю: у паляшуцкай сям'і, у грабавецкай староцы, сярод людзей старажытных, не кранутых сучаснай цывілізацыяй, мяккасцю*[3].

Сапраўды, дзяцінства В. Петручука ўскладнілася яшчэ сірочай доляй. Першыя чатыры гады жыцця хлопчыка, праведзеныя пад апекай бабулі і дзядулі, былі бесклапотнымі. Потым яго забраў бацька, які заснаваў сваю другую сям'ю. Ажаніўся ён з дзяўчынай, якая сама была сіратой. Усе спадзяваліся, што яна, па сабе ведаючы пачуцці дзіцяці, пазбаўленага мацярынскай ласкі, будзе добрай выхавацелькай маламу Васілю. Аднак пісьменніку наканавана было прайсці шмат іспытаў у безабаронным дзіцячым узросце.

Першым заняткам чатырохгадовага Васі было калыханне і пільнаванне адзінакроўных сясцёр і братоў. Потым ён пасвіў авечак, кароў, коней. Маючы каля дзесяці гадоў, парабкаваў у суседніх вёсках (Тафілаўцы, Елянка). Пасля вайны пісьменнік служыў у войску, дзе закончыў падафіцэрскую школу. Ведаючы з вопыту, што ніхто не чакае яго вяртання з вайсковай службы, В. Петручук вырашыў звязаць свой далейшы лёс з ваеннай прафесіянальнай сістэмай. Ужо як жаўнер далей паглыбляў веды на курсах разведчыкаў (Вроцлаў 1950–1951) і контрразведкі (Легіянова 1960–1961). З 1951 года жыў у Варшаве, дзе ў 1961 годзе закончыў эканамічны тэхнікум. Годам пазней перасяліўся ў Беласток, адкуль было бліжэй да родных, блізкіх сэрцу мясцін. У 1969 годзе выйшаў на пенсію.

Аповесць *Пожня* цалкам прысвечана асэнсаванню ўспамінаў пра нешчаслівае дзяцінства. Ужо сама назва кнігі дакладна перадае галоўны пафас твора. Слушна заўважае Серафім Андраюк, што назва аповесці выклікае *трохі сумнаватае адчуванне палявога апусцення, подыху восені, нейкай завершанасці пэўнага жыццёвага перыяду*[4]. Такі настрой характэрны для цэлага твора. Па зжатаму хлебнаму полю або сенажаці вельмі ж балюча ісці босымі нагамі, колецца. Туга, боль прасякаюць усю кнігу.

Кампазіцыйна аўтабіяграфічная аповесць В. Петручука падзеленая на дзве часткі, якія пабудаваны з сюжэтна завершаных апавяданняў – эцюдаў, абразкоў. Пісьменнік перадае ў дыялогах асаблівасці дыялектнага маўлення жыхароў заходніх беларускіх вёсак. Слушна заўважае Базылі Сегень, што: *Мясцовая мова прысутнічае ў творы, перш*

---

[3] С. Яновіч, *Слова аб запісаным жыцці*, [у:] В. Петручук, *Пожня...*, с. 3.

[4] С. Андраюк, *Свая старонка*, [у:] В. Петручук, *Пожня...*, с. 263.



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

*за ўсё, у выглядзе цэлых рэплік, выказванняў літаратурных герояў, з'яўляецца, (...), адным з элементаў характарыстыкі персанажаў аповесці*[5].

Цікава, што *Пожня*, напісаная па сутнасці навічком у літаратурнай справе, сталася яркім, адметным творам. Мае рацыю Уладзімір Гніламёдаў, калі гаворыць, што В. Пертучук *наіўны ў пытаннях мастацкага майстэрства і вопыту, у многім пазбаўлены літаратурнага этыкету і дыпламатычнасці, піша, творыць голай падсвядомасцю, інстынктам. Ён, тым не менш, паказвае сваіх герояў з такой бязлітаснай праўдзівасцю, на якую хто іншы не надта і здольны. У выніку – добрая мера рэалізму, зайздросная паўната ахопу ўнутранай псіхалогіі (і фізіялогіі!!) чалавека і тых, часцей за ўсё змрочных, акалічнасцей жыцця, сярод якіх ён*

У *Пожні* аўтар паказвае не толькі свой лёс сіраты-пастушка, але, зразумела, адлюстроўвае праблемы свайго часу, а дакладней – жыццё жыхароў беларускіх вёсак у перадваенны перыяд і ў час акупацыі. Прадстаўлены тут традыцыі, абрады, святы, норавы, аб чым сведчаць нават назвы апавяданняў: *Кудзельніцы, Закалядаваў, Запусты, Сенажаць, Было гэта ў Піліпаўку, Трагічная Пакрова.* Відавочна, аповяд пра важныя элементы культуры беларусаў уяўляе сабой цікавасць для чытача.

В. Петручук набліжае чытачу, асабліва таму, які нарадзіўся ў другой палове XX ст., драматычныя вобразы беднага жыцця вёскі. Сялянам не хапала ўсяго: ежы, вопраткі, элементарных сродкаў гігіены. Пры стварэнні такіх малюнкаў адчуваюцца пісьменніцкая праўдзівасць і шчырасць:

*Хто не еў зялёнага хлеба, той і не ведае, што гэта голад. Каб ратавацца ад галоднае смерці, хапаўся я найцяжэйшых работ і выконваў іх за кавалак хлеба*[7].

*Усе мы ніколі не мылі рук. Раніцай, калі хто хацеў памыцца, рабіў гэта так: квартачкай набіраў вады з вядра, а з квартачкі ў рот і паліваў сабе на рукі, якімі мыў твар. Мыццё адбывалася без мыла*[8].

---

[5] Б. Сегень, *Дыялектнае слова ў літаратурнай мове (да характарыстыкі творчасці "белавежцаў")*, "Тэрмапілы", № 7, Беласток 2003, с. 142.

[6] У. Гніламёдаў, *Літаратурнае жыццё на Беласточчыне*, [у:] Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя, т. 4, кніга 2: 1986–2000, Мінск 2003, с. 730.

[7] В. Петручук, *Пожня...*, с. 105.

[8] Тамсама, с. 9.



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

*Скулы і нарывы з мяне амаль не сходзілі. Мянялі толькі месца. Зімою абсядалі патыліцу і жывот, а летам пакрывалі ногі. Найгорш было, калі сядалі на ступнях. На адной назе было вельмі цяжка скакаць па палях за жывёлаю або за свіннямі*[9].

Апісанні аўтара з'яўляюцца вельмі дакладнымі, а ў нейкіх момантах выключна падрабязнымі. Напрыклад, паказ знутры старэнькай хаткі:

*Стаяла ў ёй печ; паміж печай і франтовай сцяною ўбудаваны быў так званы "запык". Гэта былі дошкі, укладзеныя на "стаякох", на якіх спалі бацькі і большыя дзеці, апрача, зразумела, мяне. Уздоўж ды ў нагах запечка былі прымацаваныя дзве жэрдкі, да столі. На гэтых жэрдках віселі калыскі, у якіх калыхаліся трохгадовы Іван і маленькая Нінка. Каля бакавое сцяны стаяла лава, на якой я спаў; ля стала, у кутку, знаходзіўся кульгавенькі столачак, бы маленькае, заморанае жарабятка, на якім мы "ездзілі". У канцы лавы стаяла вядро з вадою, пад лаваю – гаршкі, шаплік ды смецце, якое згарталася венікам у куток. Каля печы, з другога боку дзвярэй, вісеў ручнік, (...). Мела гэта хатка яшчэ тры аконцы з гнілымі падаконнікамі, якія не адчыняліся; ад бэлькі да задняе сцяны, пад столлю, вісела паліца, (...). На франтовай сцяне вісела шэсць, а мо і сем, святых абразоў; карычневы крыж стаяў на прыбітай падстаўцы. Пад запечкам, для выгоды, ляжала бульба, (...)*[10].

Увага В. Петручука засяроджваецца пераважна на паказе побыту, працы людзей, іхніх узаемаадносін. Лёс маці пісьменніка – Ганны, або Зіны (сястры маці) паказвае трагізм маладых дзяўчат. Яны мусілі пагаджацца з воляю бацькоў: ісці замуж за некаханага, бо не атрымалі б пасагу і не мелі б магчымасці наладзіць сабе жыццё.

Уражвае чытача жорсткасць паводзін мачыхі, яе лютасць да безабароннага дзіцяці. Не менш таксама здзіўляе незразуменне з боку бацькі, яго няўважлівасць да пачуццяў сына. У паказе духоўна-эмацыянальных перажыванняў сіраты В. Петручук выяўляе сябе майстрам псіхалагічнага, дакладнага ўзнаўлення падзей.

*Аднойчы, вяртаючыся з вёскі, пачуў я праз адчыненае акно размову мачахі з бацькам.*

*– А на чорта вуон тобіэ потрэбны? У нас есць свойе дыэты. Возьмі дэ пуд халеру забы або вывэзы, коб згынув. То ж вуон і обжырае*

9 Тамсама, с. 88.
10 Тамсама, с. 8–9.



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

*нас, і трэба ж убраты, а скуоль мы маемо на тое браты грошы. То шчэ тэпэр малый, то можэ ходыты і ў згрэбных нагавыцях, тэпэр малый, а як пудростэ, то схочэ ўбыратысь, як кавалієры, і шчо тогды зробыш?*

*– Я нэ знаю, дэ його подыэты, а ты як хочэш, то возьмі забы, – адказаў бацька.*

*Слухаць далей мне не хацелася, і я пачаў стукаць нагою аб сцяну. Пачулі і заціхлі. У хату не пайшоў. Вывеў з хлява кабылу і павёў яе на чужыя аўсы. Можа, там хто мяне злапае і без іх заб'е. Але кабыла наелася і драмала. Гаспадары таксама, відаць, спалі, бо ніхто не прыходзіў*[11].

Гэты драматычны, дынамічны ўрывак паказвае шчымлівае пачуццё безнадзейнасці сітуацыі маленькага героя. Безліч недарэчных выказванняў і адносін мачахі і бацькі да Васі даводзяць не першы раз хлопчыка да думкі аб смерці. Ён пад уплывам эмоцый правакуе свой лёс, калі бярэ каня і едзе ў чужы авёс, каб нехта іншы забіў яго. Аднак відаць хлопчыку не вызначана яшчэ паміраць. Прадстаўленая сітуацыя вельмі ярка перадае неміласэрную долю Васі, яго дзіцячыя гады, пазбаўленыя бяспечнасці, цеплаты і ўвагі бацькоў.

Хваляванне чытача выклікаюць сцэны развітання з найлепшымі сябрамі хлопчыка сабакам ды конікам. Пісьменнік знаходзіць адпаведныя словы, каб данесці горыч па іх страце. Гульня з любімым сабакам Бурыкам прыносіла радасць дзіцяці, была адзінай асалодай ў яго жыцці. Блізкім яму быў таксама разумны конік Карузэлік. Яны абодва цяжка працавалі, не ведаючы ніякай ласкі ад нікога.

Вельмі часта пісьменнікі ў сваёй творчасці вяртаюцца да дзяцінства як да спакойных, бяспечных гадоў. Звычайна яны забываюць тое, што было непрыемнае, дрэннае, а захоўваюць у памяці ўсё добрае, светлае, прыгожае, выключнае. У аповесці ж *Пожня* – маем адваротны варыянт. В. Петручук не знаходзіць амаль нічога, што выклікала б пачуцці шкадавання, жалю аб незваротным, мінулым. Вытлумачваецца гэта цяжкай экзістэнцыяй сіраты, яго бязрадасным жыццём. Крыўдны лёс аўтабіяграфічнага героя з'яўляецца ядром аповесці.

У творы В. Петручука сустракаем вобразы і добрых, спачуваючых людзей, якім неабыякавы быў лёс сіраты. Гэта, настаўніца Надзея Афанасьеўна, якая размякчала хлопчыкаву *закамянеласць, хацела зрабіць з мяне* (Васіля – А. С.) *добрага чалавека – змяніць аблог на добрае*

[11] Тамсама, с. 63–64.



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

*ўрадлівае поле. Зрабіла яна з мяне піянера*[12]. Гэта і настаўнік Арцём Сцяпанавіч, які заўсёды быў прыхільны Васілю, імкнуўся, каб хлопчык атрымаў пачатковую адукацыю, а потым намаўляў на працу ў міліцыі або УБ. Менавіта дзякуючы такім асобам, якія ў меру сваіх сіл дапамагалі В. Петручуку пераадолець жорсткую рэчаіснасць, перамагчы жыццёвыя цяжкасці, ён не счарствеў у сваіх пачуццях.

Істотнай вартасцю *Пожні* з'ўляецца праўдзівы вобраз вёскі, яе жыхароў, іх нораваў, псіхалогіі (*Не ведаю, чаму ў нас злачынства называлі "аказіяй"?*[13]), светапогляду і спадзяванняў.

Перажытыя боль, пакута, страта, як неабходнасць або непазбежнасць, часам патрабуюць часу, каб можна было ўражанні і пачуцці пераўтварыць, лакалізаваць ў сістэму мастацкага твора. Паказальна ў гэтым плане сведчанне Кірыла Хрыстова, якое прыводзіць даследчык псіхалогіі літаратурнай творчасці Міхаіл Арнаўдаў: *Пока пережитое очень свежо, особенно если оно интимного характера, я обычно не могу найти для него художественного выражения. Мне необходимо, чтобы прошло время, и боль – если дело идет о боли – утихла, и потом я искусственно ее вызываю в терпимом виде*[14].

*Пожня* – праўда жыцця, яе гісторыі – гэта творчы плён ужо досыць позняга перыяду жыцця В. Петручука. Паміж яго дзіцячымі гадамі і з'яўленнем аповесці ў друку пралегла доўгая часавая дыстанцыя. Спатрэбілася амаль сорак гадоў пісьменніку, каб успаміны змаглі ўвасобіцца ў форму мастацкага твора. Відавочна, В. Петручук імкнуўся яшчэ раз перажыць сваё сумныя сірочыя гады, каб канчаткова пазбавіцца ад гэтага траўматычнага цяжару, каб аблегчыць сваю псіхіку.

Імпульсам, які паслужыў для стварэння аповесці *Пожня* для В. Петручука была прага самавыяўлення ў споведзі пра перажытае. Несумненна, напісанне кнігі мела псіхатэрапеўтычную функцыю для яе аўтара. Натуральна, што чалавек, які прайшоў горкі шлях, мае права і на папрок, і на незадаволенасць, і на адчуванне пакрыўджанасці.

І нягледзячы на адсутнасць любові, ласкі і здзеклівыя адносіны блізкіх людзей, якія выклікалі ў хлопчыка пачуццё сваёй непатрэбнасці на свеце, а таксама жаданне сабе смерці – прага жыцця аказалася мацнейшай. Жыццё, чалавек з'яўляюцца пераможцамі ў *Пожні* Васіля Петручука.

---

12 Тамсама, с. 86.

13 Тамсама, с. 77.

14 М. Арнаудов, *Психология литературного творчества*, Москва 1970, с. 218.



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021